ВОДЗЫЎ
аб аўтарэфераце дысертацыі
Мурашкі Наталлі Уладзіміраўны
«Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору
на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі»
на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па
спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання
(вучнёўскай і студэнцкай моладзі)

Адной з умоў павышэння якасці валодання мовай з'яўляецца стварэнне ва ўстановах адукацыі развіццёвага маўленчага асяроддзя. Аўтар тэорыі развіццёвага навучання рускай мове Л.П. Федарэнка, размяжоўваючы натуральнае і штучнае маўленчае асяроддзе, адзначае, што штучнае маўленчае асяроддзе прадугледжвае асэнсаваную, мэтанакіраваную метадычную дзейнасць педагога з мэтай развіцця маўлення вучняў.

Аб'ектам дысертацыйнага даследавання Н.У. Мурашкі выступае беларускамоўнае маўленчае адукацыйнае асяроддзе ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання (І ступень агульнай сярэдняй адукацыі) – фактычна штучнае, спецыяльна змадэляванае маўленчае асяроддзе, якое непасрэдна ўплывае на фарміраванне культуры маўлення вучняў і іх асобаснае развіццё. У якасці дзейснага сродку стварэння такога маўленчага адукацыйнага асяроддзя ва ўмовах білінгвізму дысертант разглядае беларускі фальклор, патэнцыял якога прадстаўлены ў мэтавым, змястоўным і дзейнасным ракурсах (*палажэнне 2*, якое выносіцца на абарону).

Грунтоўнае тэарэтычнае абгрунтаванне працэсу мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі (вызначэнне структуры маўленчага адукацыйнага асяроддзя, прадстаўленай матывацыйным, кагнітыўным, дзейнасным і рэфлексіўным кампанентамі, – *палажэнне 1*, якое выносіцца на абарону; распрацоўка структурна-функцыянальнай мадэлі стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў адзінстве мэтавага, рэгулятыўнага, змястоўнага, працэсуальнага і выніковага блокаў – *палажэнне 3*, якое выносіцца на абарону) стала навуковым фундаментам для распрацоўкі саіскальнікам модульнай методыкі фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў праз вывучэнне фальклорных твораў. Названая методыка аб'ядноўвае аналітыка-дыягнастычны, змястоўна-дзейнасны і рэсурсна-падтрымліваючы модулі (*палажэнне 4*, якое выносіцца на абарону).

Бясспрэчную практычную значнасць мае створанае аўтарам дысертацыйнага даследавання метадычнае забеспячэнне фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў сродкамі фальклорных твораў, якое ўключае праграму аб'яднання па інтарэсах «Фальклорная скарбонка» (І–IV класы), метадычныя дапаможнікі для

настаўнікаў «Вывучэнне фальклорных твораў на ўроках беларускай мовы і беларускай літаратуры (літаратурнага чытання). 2 клас», «Фальклорная скарбонка: казачная гасцёўня. 2 клас», мультымедыйныя прэзентацыі, дэманстрацыйныя, раздатачныя матэрыялы, аўтарскі сайт «Фальклорная скарбонка» (folkskarbonka.by).

Высока ацэньваючы навукова-метадычны ўзровень праведзенага Н.У. Мурашкай даследавання, лічым патрэбным адзначыць, што з прадстаўленага ў аўтарэфераце дысертацыі апісання мадэлі стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі (с. 11–13) цяжка атрымаць уяўленне пра тое, якім чынам праз зварот на вучэбных занятках па беларускай мове і літаратуры да фальклорных твораў адбывалася, у прыватнасці, вывучэнне сістэмы моўных адзінак, заканамернасцей іх функцыянавання (змястоўны блок мадэлі, с. 12).

Хацелася б таксама атрымаць тлумачэнне адносна таго, чаму «эфектыўнасць прапанаванай мадэлі маўленчага адукацыйнага асяроддзя, методыкі і метадычнага забеспячэння была праверана на 2-іх класах» (с. 14). Як гэты факт суадносіцца з прадметам даследавання – працэсам мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, якая ўключае 1–4 класы?

Выказаныя заўвагі носяць удакладняльны характар і не зніжаюць навуковай, практычнай і сацыяльнай значнасці выкананага Н.У. Мурашкай дысертацыйнага даследавання.

Аналіз зместу аўтарэферата Н.У. Мурашкі дазваляе сцвярджаць, што праведзенае саіскальнікам дысертацыйнае даследаванне характарызуецца актуальнасцю, узаемазвязанасцю кампанентаў навуковага апарату, глыбінёй тэарэтычнага асэнсавання праблемы мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, абгрунтаванасцю вывадаў, у сувязі з чым заслугоўвае высокай ацэнкі.

Прарэктар па навуковай рабоце
дзяржаўнай установы адукацыі
"Акадэмія адукацыі",
доктар педагагічных навук, дацэнт В.У. Зелянко

ОТДЕЛ КАДРОВ
Подпись Зеленко В.У.
заверяю.
Начальник отдела С.И. Шестопалова
«____» ________________ 20____ г.